ПРАЦОЎНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ

*Газета для рабочых* *№ 2 жнівень 2009 г.*

# КРЫЗІС І ПРАЦА

## Вытворчасць скарачаюць. Па-рознаму.

На многіх прадпрыемствах Беларусі кіраўніцтва ўсё часцей выкарыстоўвае практыку скарачэння вытворчасці адпраўляючы працоўных у адпачынкі за свой кошт. У большасці ў такіх сітуацыях людзі не наважваюцца пярэчыць начальству, выконваючы іх волю і страчваючы заробкі. Аднак ёсць і такія выпадкі, калі працоўныя адмаўляюцца ісці ў адпачынкі за свой кошт.

Напрыклад, на Брэсцкім прадпрыемстве “Цветатрон” усіх рабочых хацелі адправіць на аднадзённы працоўны тыдзень. Але рабочыя не збаяліся выступіць супраць такой пастановы кіраўніцтва, і праз дэпартамент інспекцыі працы дамагліся яе адмены.

На полацкім аб’яднанні “Шкловалакно” рабочым “прапанавалі” падпісаць заявы, што яны добраахвотна жадаюць працаваць няпоўны тыдзень без аплаты прастою, але яны адмовіліся, і працуюць у звычайным рэжыме.

Бываюць выпадкі, калі людзі сам-насам супрацьстаяць наймальніку ў сітуацыях, калі пагаршаецца становішча з працай і заробкамі, і супрацьстаяць даволі паспяхова, у большасці выпадкаў яны дамагаюцца выканання законаў. Але гэта можа потым “адгукнуцца” – пры працягванні кантракта, ці яшчэ якім чынам. А вось калі працоўныя калектыўна абараняюць свае інтарэсы, такой небяспекі не ўзнікне. А найлепей абараняюцца інтарэсы і правы працоўных на тых прадпрыемствах, дзе існуюць незалежныя прафсаюзы – наймальнікі там і не спадзяюцца на безумоўнае выкананне сваіх загадаў і пастановаў, і таму не наважваюцца на адкрытыя парушэнні заканадаўства і калектыўнай дамовы.

А такая рэч, як скарачэнне працоўнага тыдня з выплатай 2/3 тарыфнай стаўкі, зараз ужываецца амаль на ўсіх прадпрыемствах Беларусі – бо па заканадаўству на гэта не патрэбная згода працаўнікоў. Іншая справа, каб не пагаджацца на адпачынак за свой кошт, трэба праявіць крыху волі і вытрымкі, а найлепей – калектыўна. Бо прымушаць ня маюць права. Няхай плоцяць 2/3, усё ж лепей, чым нічога.

Сітуацыя, што склалася на нашым заводзе, выглядае крыху інакш.

Нібыта з-за недахопу фінансаў не паспелі падрыхтаваць да працы печ №12, і давялося загадам перавесці пяты корпус працаваць па 4 гадзіны з цэхам апрацоўкі. (Дарэчы, загад гэты можна было б абскардзіць, бо выдадзены ён са значнымі парушэннямі заканадаўства.) Як паставіліся да такой сітуацыі рабочыя -- можна не казаць: не абрадаваўся ніхто, асабліва не даспадобы людзям працаваць па 4 гадзіны. Лепей было б працаваць па тыдню -- у вольны тыдзень многія маглі б дзесці падзарабіць, ці вырашыць нейкія асабістыя справы. Ды толькі адміністрацыя завода, на жаль, не хоча прыслухоўвацца да меркавання рабочых.

Печ у 4-м корпусе хоць са спазненнем, але запалілі, а вось што будзе з 2-м корпусам -- таксама пакуль цяжка меркаваць. Магчыма, давядзецца і ім па 4 гадзіны працаваць.

## Запасы гатовай прадукцыі на складах павялічваюцца

### Прычына адна – няма збыту.

Усе апошнія гады беларуская эканоміка мела экспартаскіраваны характар: чым паболей прадаваць за мяжу, каб атрымліваць валюту. Але ва ўмовах сусветнага крызысу кожная краіна намагаецца жыць максімальна выкарыстоўваючы ўласныя рэсурсы, каб найменей купляць штосці за мяжой.



*Гатовыя да продажу трактары стаяць на тэрыторыі МТЗ у вялікіх колькасцях*

Больш-менш лепшая сітуацыя з продажам сыравіны – лесу, калійных угнаенняў. Але і на “Беларуськаліі” адзначаюць значнае пагаршэнне: кошты на прадукцыю істотна зменшыліся, бо расійскія кампаніі прапануюць сваю прадукцыю на чвэрць танней.

Вельмі складанае становішча ў машына- і трактарабудаўніцтве. Рабочыя працуюць там па 2-3 дні на тыдзень, але ўсё роўна запасы гатовай тэхнікі не змяншаюцца.

Што ўжо казаць пра наш завод – каробкі з посудам хутка, напэўна, будуць ставіць пад адкрытым небам: забітыя не толькі склады, але і ўсе вольныя вытворчыя памяшканні.(Дарэчы, калі хто здумае скрасці пару-другую



*Каробкамі з посудам застаўлены ўвесь 2-гі корпус...*

**(працяг на стар. 3)**

# Генадзь Фядыніч: “Сёння дзяржава не нясе ніякай адказнасці за лёс чалавека, які застаўся без працы”.

***Беларускі прафсаюз працоўных радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП) праводзіць актыўныя кансультацыі па выпрацоўцы пат-рабаванняў да ўраду. Па словах старшыні прафсаюза Генадзя Фядыніча, ужо зараз відавочна, што ўвесь цяжар фінансавага крызыса кладзецца выключна на плечы працоўных. У прафсаюзе ўпэўненыя, што так быць не павінна.***

– Мы праводзім кансультацыі з рабочымі, распаўсюджваем у адпаведнасці з закана-даўствам нашы ўлёткі для таго, каб выпрацаваць не толькі прафсаюзныя, але і агульныя патрабаванні наёмных работнікаў да ўраду. Бо сітуацыя не паляпшаецца. І ўжо зараз відавочна, што ўвесь цяжар крызыса кладзецца на плечы працоўных, – распавёў Генадзь Фядыніч.

Старшыня прафсаюза патлумачыў сутнасць патрабаванняў, якія будуць прад’яўленыя ўраду:

– Па-першае, павінны быць адмененыя кантракты, гэта асноўнае патрабаванне. Мы маем намер прапанаваць ураду зменшыць працягласць працоўнага тыдня, захаваўшы



*Старшыня прафсаюза РЭП Генадзь Фядыніч*

пры гэтым існуючую зарплату. Такім чынам людзі змогуць яшчэ дзесці падпрацаваць, калі не хапае заробка.

Яшчэ адзін важны момант, які адзначыў Генадзь Фядыніч – адсутнасць у краіне канкрэтнай праграмы перанавучання працоўных.

– Службы занятасці працуюць па старых прынцыпах, – лічыць прафсаюзны лідэр. – Таму і не ўсе людзі там рэгіструюцца, бо няма ніякай перспектывы. Неабходна прааналізаваць сітуацыю на рынку працы і выразна вызначыць, колькі людзей нам трэба перанавучаць і на якія спецыяльнасці. А ўсё зводзіцца да таго, што чалавеку даюць няшчасныя 80 тыс.рублёў. гэта выглядае як насмешка над чалавекам, што страціў працу, які знаходзіцца ў стэсавым стане.

Па словах Генадзя Фядыніча, прафсаюз таксама мае намер узняць перад урадам пытанне аб выплаце кампенсацыі ў выпадку, калі чалавека звальняюць па сканчэнні тэрміну кантракта. У прафсаюзе лічаць, што работнік сваёй працай зарабіў трохмесячную выходную дапамогу.

– На сённяшні дзень у краіне склалася сітуацыя, пры якой дзяржава па вялікім рахунку не нясе ніякай адказнасці за тое, як будзе жыць чалавек, што застаўся без працы, – рэзюмаваў Генадзь Фядыніч. – Мы хочам, каб урад ведаў пра нашыя прапановы, нашыя патрабаванні, і будзем дамагацца іх правядзення ў жыццё.

Генадзь Фядыніч не адмаўляе, што прафсаюзныя патрабаванні вымагаюць вялікіх фінансавых выдаткаў.

– Мы разумеем, што ўсе гэтыя пытанні грашовыя, яны патрабуюць сур’ёзнай прапрацоўкі, але мы хочам , каб яны прагучалі ўжо зараз. Інакш, калі стане горача, у разліках можна зрабіць шмат памылак, – падвёў вынік старшыня прафсаюза РЭП.

***Паводле gazetaby.com***

---

## Бруду паболее?

Антыкрызісная ўрадавая група прапануе ў наступным годзе істотна скараціць выдаткі на абслугоўванне жыллёва-камунальнага сектара.

Гэта адна з прапановаў, якія павінны дапамагчы сбалансаваць бюджэтныя даходы і выдаткі ў 2010 годзе.

Па-першае, прапануецца ўсіх супрацоўнікаў ЖРЭА і ЖЭСаў, якія сёння існуюць за кошт дзяржаўных субсідыяў, зраўняць па заробках з бюджэтнікамі.

Па-другое, плануецца істотна скараціць выдаткі па тэхнічным абслугоўванні давераных ім кварталаў і дамоў.

Адным з варыянтаў рэалізацыі пастаўленай задачы павінна стаць змяншэнне перыядычнасці догляду за зялёнымі насаджэннямі і прыбірання вуліц.

Знікнуць хвалёныя “прыгажосць, чысціня і парадак”?

**Паводле газеты “Ежедневник”**

# Шкловата: плюсы і мінусы

*У мінулым нумары мы абяцалі больш даведацца пра вытворчасць шкловаты. Тое-сёе атрымалася здабыць з інфармацыі, і яе мы хочам паведаміць нашым чытачам.*

Спачатку – пра добрае. Шкловата як тавар карыстаецца даволі неблагім попытам на рынку будаўнічых матэрыялаў, і таму збыт прадукцыі, можна сказаць, забяспечаны, прынамсі на бліжэйшыя гады (бо ў Еўропе зараз больш выка-рыстоўваюць мінеральную вату, бо яна больш бяспечная). Наконт стварэння працоўных месцаў – тут не варта абнадзеівацца, абслугоўваць усю вытворчасць будуць 80-90 чалавек (а як што заробкі там павінны быць неблагія, то і ўладкавацца туды будзе цяжка, а як па нашай завядзёнцы – то толькі за грошы). Абяцаюць, што прыбыткі ад шкловаты дапамогуць падвысіць заробкі на ўсім заводзе, але ёсць меркаванне, што гэты цэх стане асобнай ад завода вытворчасцю.

Гэта былі больш-менш добрыя звесткі. А што маем з кепскага?

Кепскае тое, з чаго вырабляецца шкловата – не самое шкло, вядома, а тыя рэчывы, якія выкарыстоўваюцца для фармавання шкла ў вату, якія не даюць ёй рассыпацца. Гэта – фармальдэгідныя эмісіі і смолы. Гэта азначае, што ў паветры, якім мы будзем дыхаць, будуць знаходзіцца фармальдэгід і спадарожныя яму рэчывы: фенол і метанол. Усе яны з'яўляюцца канцэрагеннымі і таксічнымі. Трапляючы ў арганізм, яны выклікаюць галаўныя болі, раздражненне органаў дыхання, слізістых тканак.



*Зараз у 3-м корпусе страшны развал. Пасля тут будзе страшная вытворчасць*

Да таго ж, у паветры заўсёды будзе шкляны пылок, што таксама не вельмі прыемна, пагадзіцеся. Колькасць захворванняў на бранхіты адразу падскочыць у разы.

Ну як вам перспектыва? Мне – не надта. Страшнавата становіцца ня толькі за дзяцей, але і за дарослых. І так сярэдняя працягласць жыцця ў Бярозаўцы ніжэй, чым па ўсёй Беларусі, а тут яшчэ такі падарунак.

Хацелася б пачуць нейкую інфармацыю ад афіцыйных асобаў – мясцовых уладаў, кіраўніцтва заводу. Хай бы зладзілі сустрэчу з жыхарамі гораду, патлумачылі сітуацыю. Але не любіць начальства сустракацца з народам. Яны прывыклі, што іх загады і жаданні маўкліва вы-конваюцца.

**P.S. На сайце http://biarozauka.belarda.org праводзілася апытанне "Як Вы ставіцеся да вытворчасці шкловаты ў Бярозаўцы?". Публікуем вынікі:**
**"За" - 25%;**
**"Катэгарычна супраць" - 58%;**
**"Супраць, але вырашае начальства" - 17%;**
**"Мне ўсё роўна" - 0%.**
**Дзякуй Богу, абыякавых няма.**

***Яська Нязгодны***

---

# Запасы гатовай прадукцыі на складах павялічваюцца

## Прычына адна – няма збыту.

(пачатак на стар.1)

каробак, то гэта будзе няцяжка зрабіць).

Магчыма, урад спадзяецца на тое, што эканоміка Еўрапейскіх краінаў хутка выйдзе з крызісу, і тады можна будзе рэалізаваць на іх рынках назапашаныя тавары. Але гэтыя спадзевы, хутчэй за ўсё, марныя.Навучаныя крызісам, замежнікі таксама будуць намагацца як найменш залежаць ад знешніх фактараў. Таму і ў нас трэба праводзіць кардынальную рэформу эканомікі, рабіць яе мінімальна залежнай ад імпартнай сыравіны, максімальна выкарыстоўваць уласныя рэсурсы.

А наш завод, па меркаванню спецыялістаў, чакаюць сур'ёзныя скарачэнні вытворчасці: ручным вырабам вельмі цяжка канкураваць на рынку з вырабамі механічнай вытворчасці, якія па сабекошце нашмат танней. Таму цалкам магчыма, што застанецца ўсяго дзве, максімум тры печы. Вось толькі што рабіць тым, каму не хопіць месца на заводзе?



***...а таксама і праход паміж 1-м і 2-м карпусамі***

***П.Кілішкевіч***

## Кожнаму – сваё?

### У сувязі з крызысам урад Літвы прадае службовыя аўтамабілі.

За кошт продажу паловы службовых аўтамабіляў літоўскія ўлады разлічваюць зэканоміць каля 12 млн.даляраў. Раней урад Літвы прыняў цэлы шэраг мер, закліканых скараціць дзяржаўныя выдаткі і зменшыць дэфіцыт бюджэту. У прыватнасці, былі зніжаныя заробкі дзяржслужачых (уключна з міністрамі), адмененыя некаторыя падатковыя льготы.

### На чым ездзяць беларускія чыноўнікі ?

Міністэрства транспарту прыадчыніла "дзяржаўную таямніцу" – гараж службовых аўтамабіляў беларускіх чыноўнікаў. На чым жа ездзяць нашыя наменклатуршчыкі?
Ёсьць там такія аўто, як Audi Q7, Крайслер Гранд Ваяж, Хаммэр H2, BMW7, Порш Кайен, Infiniti FX45, Graet Wall, SsangYong. Апроч таго, што кошты гэтых машын, мякка кажучы, немалыя, дык і расход паліва таксама ўражвае – ад 15 да 18 літраў на 100 км. Вось такая эканомія бюджэтных сродкаў.

................

## Латвія эканоміць. На чыноўніках і не толькі

Сейм Латвіі падтрымаў папраўкі да дзяржбюджэта, якія прадугледжваюць скарачэнне пенсій і зарплат чыноўнікаў.

Згодна з папраўкамі, з 1-га ліпеня заробкі чыноўнікаў змяншаюцца на 20%, пенсіі па ўзросце і выслуге гадоў – на 10%, пенсіі працуючым пенсіянерам – на 70%, дапамога на дзяцей працуючым бацькам – на 50%.

................

## Чакаць падвышэння тарыфаў?

Міністэрства ЖКГ не выключае магчымасці падвышэння тарыфаў на паслугі ў межах 3$. Пра гэта паведаміў намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Сяргей Сушко.
"Падвышэнне тарыфаў магчымае, але для гэтага яшчэ трэба падрыхтаваць адпаведную базу, як мінімум неабходна падвысіць пенсіі грамадзянам. Напэўна, тады можна было б разгледзець пытанне пра падвышэнне тарыфаў на паслугі ЖКГ (водазабеспячэнне, тэхабслугоўванне, рамонт ды інш.) за выключэннем энэргетычных" – паведаміў намеснік міністра. Па яго меркаванню, такое падвышэнне магло б быць у межах 3-х даляраў, для стандартнай двухпакаёвай кватэры з трыма жыхарамі – каля 9 тыс.рублёў.

Магчымых тэрмінаў падвышэння тарыфаў Сяргей Сушко не назваў, падкрэсліўшы, што гэтае пытанне можа быць разгледжанае, а вырашэнні па ім будзе прымаць Мінэканомікі. Разам з тым, некаторае падвышэнне тарыфаў на паслугі ЖКГ забяспечыла б паступленні для нармальнага правядзення ацяпляльнага сезона і правядзення работ у жыллёва-камунальнай гаспадарцы пасля яго сканчэння.

*Паводле БЕЛТА*

................

## За год заробкі бюджэтнікаў зменшыліся на 45$

Паводле афіцыйнай статыстыкі, у доларавым эквіваленце заробкі беларусаў зменшыліся ў сярэднім на 30 долараў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. У першым паўгоддзі 2008 г.сярэднемесячны заробак у краіне складаў каля 374 $, а за студзень - чэрвень 2009г. - усяго каля 342 $.
У бюджэтным сектары эканомікі сярэднемесячны заробак у першай палове бягучага года павялічыўся ў рублях на 12,2% і склаў 761,9 тыс.руб ці 272$. Год таму бюджэтнікі ў сярэднім атрымлівалі амаль на 45 долараў болей - 315$.

*Паводле "Завтра твоей страны"*

................

## Падрыхтоўка да школы: колькі трэба грошай?

Падлічана, што для вучняў малодшых класаў поўная школьная экіпіроўка будзе каштаваць ад 417 да 740 тыс.рублёў, а для старшакласнікаў – ад 518 да 995 тыс.рублёў. прытым толькі на школьна-пісьмовыя прылады спатрэбіцца ад 100 да 300 тыс.рублёў на год.

На фоне зніжэння рэальных даходаў насельніцтва, выдаткі на падрыхтоўку дзяцей да школы стануць істотнай нагрузкай на сямейны бюджэт.

*Паводле БелаПАН*

................

## Апусціліся на трэцяе месца

Па выніках першага паўгоддзя, Беларусь "заняла" трэцяе месца сярод краін былога СССР па росце спажывецкіх цэнаў. У першым квартале мы былі "лідэрамі" ў гэтым спісе. Зараз нас абганяюць Украіна і Расія. Праўда, няма дадзеных па Узбекістану і Туркменістану.

**ПРАЦОЎНАЯ САЛІДАРНАСЦЬ**
**Інфармацыйна-аналітычнае выданне**
**г.Бярозаўка**
**Рэдактар і выдавец**
**П.Кілішкевіч**
**Адказны за выпуск**
**Яська Нязгодны**
**Наклад 299 асобнікаў**
**Распаўсюджваецца бясплатна**
**Друкарня "*Вольны працаўнік*"**